2014 IIHF WORLD CHAMPIONSHIP BELARUS Minsk

Як швейцарскія хакеісты вярнуліся на п'едэстал праз 60 гадоў

Краіна гор, сыру, гадзіннікаў і шчаслівых людзей — усё гэта, безумоўна, пра Швейцарыю. Якое месца тут займае спорт моцных і адважных мужчын?

Цікавасць гледачоў да хакея ў Швейцарыі вельмі высокая, матчы адрозніваюцца вялікай наведвальнасцю. Хакейны клуб Берна (SCB) з'яўляецца лідарам у Еўропе. Яго матчы прыходзяць паглядзець у сярэднім 15,8 тысячы балельшчыкаў.

Гісторыя швейцарскага хакея вельмі доўгая, але не вельмі яркая. Хакей там пачаў развівацца ў пачатку XX стагоддзя, а членам IIHF (Міжнародная федэрацыя хакея з шайбай) швейцарцы з'яўляюцца з 1908 года, гэта значыць, з самага яе заснавання. Усе хакейныя дасягненні швейцарцаў адбыліся да 1953 года, а самыя вялікія поспехі былі ў перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі.

1953 год стаў апошнім (да 2013-га), калі Швейцарыя была прызёрам чэмпіянатаў свету. На Алімпійскіх гульнях прадстаўнікі альпійскай краіны двойчы падымаліся на трэцюю прыступку п'едэстала. Гэтыя дасягненні датуюцца далёкімі 1928-м і 1948-м гадамі.

У сучасным хакеі зборную Швейцарыі прынята лічыць моцным «серадняком»: яна знаходзіцца на 7 месцы ў сусветным рэйтынгу IIHF. Усе чакаюць ад яе як мінімум выхаду ў плэй-оф, але так ужо склалася — не лічаць прэтэндэнтам на медалі. Мяркуйце самі: зборная пастаянна знаходзіцца дзесьці ў сярэдзіне эліты, займаючы 7—9 месцы.

На чэмпіянаце свету 2010 года Швейцарыя заваявала высокае пятае месца, а ўжо праз год апусцілася на дзявяты радок. Чэмпіянат свету 2012 года атрымаўся для швейцарскай каманды правальным. Пачаўшы з перамогі над Казахстанам і Беларуссю, швейцарцы пацярпелі пяць паражэнняў запар, прычым не толькі ад грозных зборных Фінляндыі, Канады, ЗША і Славакіі, але і ад зборнай Францыі. У выніку яны занялі толькі шостае месца ў групе і не выйшлі ў плэй-оф. Нягледзячы на правал, кваліфікацыйных ачкоў хапіла, каб атрымаць пуцёўку на Алімпіяду ў Сочы.

Новая адпраўная кропка ў гісторыі зборнай

Чэмпіянат свету 2013 года займае асобнае месца для зборнай Швейцарыі. На групавым этапе каманда атрымала сем перамог у сямі матчах, уключаючы вікторыі над зборнымі Канады, Швецыі і Чэхіі. У чвэрцьфінале швейцарцы перайгралі ўсё тых жа чэхаў з лікам 2:1, а ў паўфінале перамаглі амерыканцаў з лікам 3:0. У вырашальным матчы зборнай Швейцарыі супрацьстаялі гаспадары турніру шведы, і на фінальную гульню ў швейцарцаў банальна не хапіла сіл — яны саступілі 5:1. Але, заваяваўшы сярэбраныя медалі, паўтарылі свой поспех 78-гадовай даўніны. У аэрапорце Цюрыха гульцоў зборнай сустракалі больш за дзве тысячы балельшчыкаў і мора чырвоных сцягоў.

Увага да дробязяў — прыкмета сапраўднага майстра

Шон Сімпсан — гэта гісторыя швейцарскага хакея. Трэнер адыгрывае вялікую ролю ў гэтай зборнай. Канадзец узначальвае ўсю хакейную сістэму ў Швейцарыі з 2009 года. Многія спецыялісты трыумф у 2013-м лічаць менавіта яго заслугай. Сімпсан паклікаў у зборную сем навічкоў, у камандзе — пяць чалавек з Kloten Flyers (клуба, які заняў толькі дзявятае месца па выніках рэгулярнага чэмпіянату NLA), няма ніводнага чалавека з Fribourg — Gotteron (клуба, які выйграў у «рэгуляркі» і дайшоў да фіналу плэй-оф мясцовага першынства), няма ніводнага гульца НХЛ. Швейцарскія журналісты з такім складам прадракалі Сімпсану правал. Але канадзец прывёў зборную да п'едэстала. Пастфактум спецыялісты скажуць, што «фішкай» Сімпсана стала размеркаванне гульнявога часу. Гэта тычыцца не толькі палявых гульцоў, але і варатароў. Трэнер прывёз на чэмпіянат чатыры звёны, якія ў выніку «перабегалі» шведаў, канадцаў і амерыканцаў.

Хілер — Плюс — Ёсі = алімпійскія надзеі

На Алімпійскіх гульнях у Сочы ад Швейцарыі чакалі наступных медалёў і як мінімум удалай гульні. Але надзеі не спраўдзіліся. У чатырох матчах хакеісты закінулі толькі тры шайбы, у вырашальным паядынку прайгралі латышам і не прабіліся ў чвэрцьфінал. І хакеісты, і трэнеры засталіся незадаволенымі сваёй працай і прызналі сваё выступленне няўдалым.

Швейцарыя — Беларусь

Усё ж такі адзначым моцныя бакі швейцарцаў, што вельмі актуальна для беларускай зборнай напярэдадні чэмпіянату свету. Швейцарыя заўсёды славілася сваёй бліскучай варатарнай школай. Многія з яе выхаванцаў гуляюць у НХЛ. Можам выказаць здагадку, што ў Мінску менавіта гэта стане козырам швейцарцаў. Кіпер «Анахайма» Хілер — першы нумар у клубе. Бера імкнецца да гэтага ў «Калгары». Акрамя таго, моцныя варатары гуляюць і ў швейцарскай лізе. Плюс надзейная абарона: вопытны Марк Штрайт і малады абаронца «Нэшвіла» Раман Ёсі. Ёсі ўжо прызнаны MVP ЧС-2013, удзельнік трох Алімпійскі хгульняў універсальны Матыяс Зегер можа быць лідарам не толькі на лёдзе, але і за яе мяжой, а таксама знакамітыя Фюрэр і Бліндэнбахер. Касцяк нападаючых складаюць гульцы швейцарскай лігі: Андрэс Амбюль («Давос»), Матыяс Бібер, Сімон Бодэнман (абодва — «Клотэн»), Лука Кунці, Морыс Трахслер, Раман Вік (усе — «Цюрых»), Раян Гарднер, Марцін Плюс (абодва — «Берн»). Ім могуць дапамагчы і НХЛаўцы Дам'ен Брунер, Сымон Мозэр і Ніно Нідэрайтэр.

Зборная Беларусі на хатнім чэмпіянаце згуляе са Швейцарыяй у чацвёрты дзень турніру — 12 мая. Каманды сустракаліся на сямі чэмпіянатах свету. Статыстыка перамог — на баку альпійцаў, прычым часцей за ўсё матчы заканчваліся з перавагай швейцарцаў у адну шайбу.

Зусім нядаўна, 21 снежня 2013 года, зборныя згулялі таварыскі матч у рамках турніру «Ароза Чэлендж». Асноўны час і авертайм не змаглі выявіць пераможцу — беларусы атрымалі перамогу ў серыі булітаў.

Разважаючы пра склад каманды Швейцарыі, не варта рабіць агаворку пра тое, што вядучыя яе хакеісты, якія гуляюць у НХЛ, могуць не прыехаць у Беларусь. Папярэдні чэмпіянат свету паказаў, што змагацца за медалі гэтая каманда можа і з гульцамі нацыянальнага першынства. Тым больш што швейцарская ліга дастаткова моцная. Няўдалае выступленне ў Сочы можа стаць дадатковым стымулам, каб сур'ёзна падрыхтавацца да чэмпіянату свету — 2014.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 1 сакавіка.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.03	18.42	10.39
Віцебск —	7.55	18.30	10.35
Магілёў —	7.53	18.32	10.39
Гомель —	7.48	18.31	10.43
Гродна —	8.18	18.58	10.40
Брэст —	8.16	19.01	10.45

Імяніны

Пр. *Абрама, Ісака, Кірылы, Міхаіла, Фёдара.*
К. *Анастасіі, Васіля, Віктара, Леанарда, Юльяна.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

1520 год — нарадзіўся Астафій (Яўстафій) Валовіч, дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. У 1551—1566 гадах — пісар ВКЛ, маршалак дворны, у 1561—1566 гг. — падскарбій земскі ВКЛ, у 1566—1579 гг. — падканцлер ВКЛ, з 1579-га — канцлер ВКЛ і кашталян віленскі; стараста магілёўскі, езярышчанскі, берасцейскі, кобрынскі, рэчыцкі. Удзельнічаў у Лівонскай вайне 1558—1583 гадоў. З іншымі магнатамі ВКЛ узначальваў апазіцыю пры заключэнні Люблінскай уніі 1569 года. Адзін з арганізатараў падрыхтоўкі Статута ВКЛ 1566 г., садзейнічаў уключэнню ў Статут прагрэсіўных нормаў. Быў прыхільнікам кальвінізму, у канцы жыцця схіляўся да антытрынітарызму. Падтрымліваў гуманістаў В. Цяпінскага, С. Буднага, які прысвяціў яму кнігу «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам». Памёр у 1587 годзе.

1919 год — 95 гадоў таму ў Вільні адбылося сумеснае пасяджэнне ЦВК Беларускай ССР і ЦВК Літоўскай ССР, на якім было абвешчана аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР са сталіцай у Вільні; абраны сумесны ЦВК (старшыня К.Г. Ціхоўскі) і створаны Савет Народных Камісараў Літоўска-Беларускай ССР (старшыня В.С. Міцкевіч-Капсукас). У складзе новай дзяржавы засталася тэрыторыя Віленскай, Мінскай, частка Гродзенскай і Ковенскай губерняў.

1919 год — адбылася першая ў Савецкай Расіі радыёвяшчальная перадача. У жніўні 1918 года была створана Ніжагародская радыёлабараторыя — першы ў Расіі навукова-даследчы і эксперыментальны цэнтр у галіне радыё- і тэлетэхнікі. У лабараторыі працавала група спецыялістаў пад кіраўніцтвам Міхаіла Аляксандравіча Бонч-Бруевіча. Тут былі створаны радыётэлефон і першыя радыёлямпы. А 27 лютага 1919 года па радыё замест сігналаў азбукі Морзэ быў перададзены голас чалавека. Дыктар сказаў: «Алё, алё. Гаворыць Ніжагародская радыёлабараторыя». Так быў паспяхова выкарыстаны радыётэлефонны перадатчык. Радыё і тэлефон злучыліся. Заставалася дадаць выяву.

Было сказана **Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, пісьменнік, публіцыст, кінасцэнарыст:**

«Наконт таго, ці шмат здолее адзін.
Нават адзін здолее, калі ідзе да канца».

УСМІХНЕМСЯ

Прыйшоў уладкоўвацца на працу і заснуў на канапе ў прыёмнай. Вось бачыце, як я хутка адаптуюся на новым працоўным месцы?

Адэса, на вуліцы.

— Фіма, і што, вы ў восьмы раз вярнуліся да свайго Сёмы?

— Вой, Фаечка, ну што я магу зрабіць? Як толькі я сыходжу ад яго, у гэтага дурня тут жа з'яўляюцца грошы!

Навіны дня.

У Расіі ўвялі новае дзяржаўнае свята — Дзень цвярозасці. Насельніцтва ў шоку: ніхто не ведае, як яго адзначаць!

Дзве сяброўкі.

— Вось сустракаюся цяпер адначасова з двума мужчынамі і не ведаю, каго выбраць.

— А што табе сэрца падказвае?

— Сэрца падказвае: муж даведаецца — заб'е!

caricatura.ru

НАРОДЖАНЫЯ 27 лютага

Дзякуючы рэалістычнаму падыходу да рэчаіснасці, гэтыя людзі старанна прадумваюць кожны крок, разлічваюць на ўласную мудрасць, кемлівасць для распрацоўкі новых і больш амбіцыёзных праектаў. Самыя вялікія складанасці ўзнікаюць у іх асабістым жыцці таму, што яны вельмі патрабавальныя. Часта яны не могуць адрозніць тое, што імкнуцца атрымаць, ад таго, што ім сапраўды неабходна. Яны лічаць, што іх праблемы павінны вырашаць іншыя, таму ўвесь час шукаюць рамантычнага кахання і часта аказваюцца каля «разбітых ночваў». Яны адчуваюць сябе шчаслівымі толькі тады, калі могуць выкарыстаць свае веды. Іх непераможнае жаданне ўзняцца над іншымі не павінна душыць інтарэсы гэтых людзей. Яны дасягаюць поспеху, дзякуючы спалучэнню спачування і сілы волі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.315. Індэкс 63850. Зак. № 776. Нумар падпісаны ў 19.30 26 лютага 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12